*І. Г. Лупашка,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,*
*г. Мінск*

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЫ СРОДКАМІ МУЗЕЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Народная медыцына – сукупнасць назапашаных народам эмпірычных звестак аб лекарскіх сродках і іх практычным ужыванні для захавання здароўя, папярэджання і лячэння хвароб, а таксама аб лекавых і гігіенічных прыёмах і навыках. Многія народныя сродкі лячэння выкарыстоўваюцца сучаснай навуковай медыцынай [9]. Блізкімі па значэнню з'яўляюцца паняцці *камплементарная*, *альтэрнатыўная*, *нетрадыцыйная* медыцына.

Заўважым, што ў 2003 г. адно з пытанняў у павестцы Сусветнай асамблеі аховы здароўя было прысвечана народнай медыцыне. Там адзначалася, што тэрмін *народная медыцына* ахоплівае шырокі дыяпазон відаў лячэння і практыкі, якія значна вар'іруюцца ад краіны да краіны і ад рэгіёна да рэгіёна; што народная медыцына мае шмат станоўчых характарыстык і яе практыкі адыгрываюць важную ролю ў лячэнні хранічных хвароб, а таксама ў паляпшэнні якасці жыцця людзей, якія пакутуюць ад нязначных захворванняў або ад некаторых невылечных хвароб. Таксама гаварылася аб тым, што веды народнай медыцыны належаць абшчынам і народам, у якіх гэтыя веды з'явіліся, і павінны поўнасцю паважацца. Тым не менш адзначаліся і праблемы прымянення народнай медыцыны: адсутнасць арганізаваных сетак практыкаў народнай медыцыны і абгрунтаваных фактычных даных па яе бяспецы, эфектыўнасці і якасці [10].

Цікавасць да народнай медыцыны з пункту гледжання яе аховы як культурнай спадчыны праяўляюць таксама музеі і ўстановы музейнага і змешанага тыпу. Так, Асацыяцыяй медыцынскіх музеяў у 2007 г. у Загрэбе быў праведзены Міжнародны практычны семінар «Збор матэрыялаў па народнай медыцыне» [11]. Членам асацыяцыі музеяў гісторыі медыцынскіх навук з 1994 г. з'яўляецца і Музей гісторыі медыцыны Беларусі.

Пытанням рэпрэзентацыі народнай медыцыны сродкамі музейнай дзейнасці прысвечаны нешматлікія навуковыя публікацыі, артыкулы ў перыядычным друку, інтэрнэт-крыніцы.

Этнакультурнымі аспектамі народнай медыцыны цікавіцца расійская даследчыца Л. П. Журбіна. Яна слушна адзначае, што народнае лекаванне цесна ўзаемазвязана з матэрыяльнай і духоўнай этнакультурай, у тым ліку з народнай філасофіяй, педагогікай і псіхалогіяй, фальклорам, звычаямі, забабонамі і рытуаламі. Даследчыца коратка апісвае дзейнасць некаторых музеяў народнай медыцыны, напрыклад Музея традыцыйнай карэйскай медыцыны ў г. Тэгу, Музея павятовай медыцыны імя У. М. Бехцерава (у структуры Елабужскага дзяржаўнага гісторыка-архітэктурнага і мастацкага музея-запаведніка) і інш. [4, с. 120].

Адзначым, што прадметам нашага даследавання не з'яўляюцца краязнаўчыя, этнаграфічныя і іншыя музеі. У некаторых з іх можна знайсці асобныя прыклады рэпрэзентацыі народнай медыцыны. Аднак, гэта адзінкавыя экспанаты, ці невялікія экпазіцыйныя раздзелы або тэмы ў шэрагу іншых, якія носяць другасны характар у адносінах да асноўнай тэмы экспазіцыі.

Больш падрабязна разгледзем медыцынскія музеі і экспазіцыі. У значнай колькасці краін ёсць агульнамедыцынскія музеі (музеі гісторыі медыцыны), якія, як правіла, маюць раздзел, прысвечаны народнай медыцыне.

Напрыклад, у Музеі гісторыі медыцыны Беларусі першы раздзел экспазіцыі «Узнікненне народнай медыцыны і лекавання» складаецца з матэрыялаў археалагічных, палеаантрапалагічных і палеапаталагічных даследаванняў. Яны дазваляюць меркаваць аб фізічным развіцці людзей, якія жылі на тэрыторыі Беларусі ў старажытнасці, захворваннях і старажытных прыёмах лекавання. У раздзеле расказваецца аб ведах і звычаях, накіраваных на ахову здароўя і датычных гігіены харчавання, жылля, асабістай гігіены. Адмысловае месца ў экспазіцыі займаюць матэрыялы, якія адлюстроўваюць сувязь старажытных вераванняў і рэлігіі з лекаваннем [2].

У Баскскім музеі гісторыі медыцыны і навукі працуе стацыянарная выстава «Народная медыцына і альтэрнатыўная медыцына», якая з'яўляецца адной з найбольш ранніх экспазіцый

музея. Адна з залаў прысвечана знакамітаму баскскаму этнографу Хасэ Мігелю дэ Барандзіарану, які займаўся даследаваннем народнай медыцыны. Асаблівы акцэнт у экспазіцыі зроблены на праблемах вядзьмарства [6].

Музеяў, якія прысвечаны менавіта народнай медыцыне, не так шмат. Адзін з іх – музей народнай медыцыны імя Мірзо Алімава (Таджыкістан, г. Ісфара). Музей заснаваны ў 1970 г. на базе санаторыя «Зумрад» па ініцыятыве галоўнага ўрача. Сёння ён уваходзіць у аб'яднанне музеяў г. Ісфара. Фонды налічваюць больш за тысячу прадметаў, усе яны прадстаўлены ў экспазіцыі: узоры флоры і фауны, археалагічныя знаходкі, этнаграфічныя рэчы, рукапісы, друкаваныя выданні і фатаграфіі, творы жывапісу і скульптуры. Экспазіцыя музея расказвае аб развіцці ў Таджыкістане сістэмы аховы здароўя і фармакалогіі, прадстаўляе розныя ўстановы галіны і асобных спецыялістаў. Раздзел «Прырода і культура Ісфарынскага раёна» знаёміць з лекавымі раслінамі, фаунай, лячэбнымі крыніцамі і мінераламі, метадамі вытворчасці алеяў, традыцыйнымі народнымі спосабамі лячэння ў таджыкаў шляхам абкурвання, народнымі прыёмамі догляду дзяцей і хворых [8].

Персанальныя медыцынскія музеі па разглядаемай тэматыцы нешматлікія, але ўсё ж існуюць. Напрыклад, у г. Бад-Вёрысхофен (Германія) існуе музей Себасцьяна Кнэйпа, нямецкага каталіцкага святара, які стаў вядомым, дзякуючы створанай ім метадыцы водалячэння. Поруч з біяграфічнай часткай экспазіцыі існуе зала, якая дэманструе 5 прынцыпаў лячэбнага працэсу Кнэйпа: вада, фізічныя практыкаванні, лекавыя травы, харчаванне і парадак [1].

Нямецкай манахіне, багаслову і лекару Хільдэгардзе фон Бінген прысвечана стацыянарная экспазіцыя ў музеі (Museum am Strom) г. Бінген (Германія). Жанчына, якая жыла ў XII ст., напісала «Кнігу аб унутранай сутнасці розных прыродных стварэнняў», якая складаецца з дзвюх частак: «Кніга аб простай медыцыне» і «Кніга аб складанай медыцыне». У першай з іх апісваюцца расліны, мінералы, дрэвы, камяні, жывёлы і металы з уласцівымі ім лячэбнымі і нелячэбнымі якасцямі. Мастацтва лекарства Хільдэгарды фон Бінген у Германіі вядома нашмат больш, чым яе багаслоўскія працы, дзякуючы аўстрыйскаму лекару Готфрыду Хертцка. Ён пераклаў рэцэпты з лацін-

скай мовы і выкарыстоўваў іх на практыцы. На аснове гэтага была распрацавана лекарская методыка па вучэнню Хільдэгарды, якая выкарыстоўваецца і сёння ў альтэрнатыўнай медыцыне.

У экспазіцыі «Хільдэгарда фон Бінген. Жыццё і праца» расказваецца пра розныя аспекты жыцця і дзейнасці манахіні. Дапаўненнем да гісторыка-біяграфічнай экспазіцыі з'яўляецца «Хільдэрсад», у якім вырошчваецца мноства раслін, якія апісаны ў працах лекаркі. Жывая экспазіцыя знаёміць наведвальнікаў з мысленнем Сярэдневякоўя і «Кнігай раслін» [16].

Больш падрабязна звернемся да рэпрэзентацыі народнай медыцыны музейнымі сродкамі ў Беларусі.

З выяўленых экспазіцый толькі адна знаходзіцца ў структуры музея – філіял традыцыйнай культуры «Дом траўніка» Мотальскага музея народнай творчасці (в. Стрэльна, Іванаўскі р-н, Брэсцкая вобл.) [13]. Філіял быў адкрыты ў 1991 г.

У «Доме траўніка» знаходзіцца некалькі залаў: інфармацыйная; расліны і здароўе; зёлкі (травяністыя лекавыя расліны); лекавыя дрэвы і хмызнякі; лекавыя расліны саду і агарода; бабулін пакой; гасцёўня. Таксама ёсць асобны пакой, экспазіцыя якога расказвае, як даглядалі нованароджанага і чым лячылі дзіцячыя хваробы. Галоўныя экспанаты музея – гербарый зёлак, якіх больш за 120 адзінак. Таксама ў музеі захоўваюцца рукапісы з запісамі рэцэптаў мясцовых знахарак. Для наведвальнікаў прапаноўваецца экскурсія «Бабуліны сакрэты».

Пры музеі створаны фітабар, дзе можна пакаштаваць свежазаваранай гарбаты і набыць лекавыя зборы [14].

Яшчэ некалькі экспазіцый аб народнай медыцыне створаны пры бібліятэках і дамах культуры. Адна з іх працуе ў в. Старая Буда Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці і вядома як «Дом-музей народнай медыцыны». Аднак заўважым, што з пункту гледжання музеялогіі такая назва з'яўляецца некарэктнай. У музейнай справе паняцце «дом-музей» выкарыстоўваецца ў двух варыянтах: 1) мемарыяльны музей, які створаны ў будынку, што звязаны з гістарычнай падзеяй ці гістарычнай асобай; 2) гісторыка-бытавы ці гісторыка-мастацкі музей, які створаны ў будынку, тыповым для вызначанага сацыяльнага пласта ці архітэктурнага стылю, у якім захоўваюцца ці ўзнаўляюцца тыповыя інтэр'еры і побытавая абстаноўка [3].

Адкрыццё экспазіцыі адбылося ў 1992 г. па ініцыятыве аддзела культуры Буда-Кашалёўскага райвыканкама рашэннем Старабудскага сельсавета. Арганізавала працу бібліятэкар і вядомая ў раёне траўніца Н. У. Сярэбраная.

У экспазіцыі прадстаўлены лекавыя травы і зборы: кожны збор мае сваё лекавае прызначэнне і да яго прыкладаецца рэцэпт прыгатавання. Усяго прадстаўлена каля 30 відаў зёлак: багун, глог, валяр'яна, мацярдушка, святаяннік, мяліса, мята, хвошч палявы, шалфей, шыпшына і інш. Таксама ў экспазіцыі прадстаўлена карта-схема распаўсюджвання лекавых раслін на тэрыторыі Губіцкага сельсавета, гербарый, стэнд «Сардэчна запрашаем у зялёную аптэку», выстава «Дары прыроды».

Калі гаварыць пра рэалізацыю ўстановай музейных функцый, то адзначым культурна-адукацыйную. Для наведвальнікаў праводзяцца экскурсіі, конкурсы-гульні «Хто ведае больш лекавых раслін», «З гісторыі Чырвонай кнігі». Створана аматарскае аб'яднанне «Здароўе ў нашых руках». Штогод бібліятэчнымі і клубнымі работнікамі сумесна з работнікамі ФАПа распрацоўваюцца планы. Тэматыка заняткаў даволі разнастайная: экалогія, інфармацыйна-пазнавальныя гадзіны здароўя і інш. Арганізоўваюцца лекцыі, гутаркі на тэмы: «Я здароўе берагу – сам сабе дапамагу», «Лячэнне ягадамі» і інш. Пасяджэнні праводзяцца штомесяц. Члены аб'яднання займаюцца вывучэннем методыкі падрыхтоўкі лекавых раслін па спецыяльнай літаратуры, арганізоўваюць сустрэчы з мясцовымі лекарамі, вядзецца картатэка мясцовых травазнаўцаў. Важным перыядам у рабоце аматарскага аб'яднання з'яўляецца збор лекавых раслін у вясенне-летні перыяд [5].

Падобны падыход абраны і ў в. Збораў Рагачоўскага раёна, дзе пры мясцовым доме культуры працуе экспазіцыя «Таямніцы гаючых раслін». Ініцыятарам стварэння стала дырэктар Збораўскага сельскага дома культуры А. Варанцова. Па функцыях «музей» больш нагадвае фітааптэку і мае практычную накіраванасць: «На паліцах – ужо нарыхтаваныя народныя лекі. У канцы сезона іх тут да паўсотні ад любой хваробы. Праўда, ужо да вясны музейныя паліцы парадзеюць, бо экспанаты будуць выкарыстаны па прамым прызначэнні, для лячэння» [7]. Пры ўстанове арганізавана аб'яднанне збіральнікаў траў, якія стварылі карту лекавых раслін усёй ваколіцы.

Гаворачы пра прэзентацыю народнай медыцыны, нельга не ўзгадаць аптэкі-музеі. Ёсць прыклады такога тыпу музеяў і ў Беларусі.

Тэматычны парк гісторыі Сярэдневякоўя «Вялікае княства Сула» ў раздзеле «Беларускае мястэчка» прадстаўляе траўную аптэку «Зёлкі». Залы аптэкі-музея распавядаюць аб асаблівасцях лячэння ў даўнія часы. Асобная экспазіцыя прысвечана ўрачу Станіславу Вількоцкаму, які доўгі час кіраваў аптэкай у суседніх Рубяжэвічах і сумяшчаў сучасную навуковую медыцыну са старымі традыцыямі лячэння зёлкамі. Персанальная экспазіцыя складаецца з дзвюх частак: працоўны кабінет і жылы пакой [2].

Адзначым прафесійны музейны падыход пры стварэнні аптэкі-музея ў г. Гродна, якая дзейнічае ў структуры ААТ «НПК Біятэст». Музей створаны ў гістарычным будынку, дзе і раней некалькі стагоддзяў працавала аптэка. На дадзены момант, будынак падзелены на дзве часткі: дзеючая аптэка і музейная экспазіцыя. Сучасная стацыянарная экпазіцыя адкрыта ў 2005 г. Адзін з радзелаў прадстаўляе какторый – травяную лабараторыю, якая ўладкоўвалася ў добра асветленым, сухім пакоі з печкай, каменнай ці керамічнай падлогай. У ёй было простае абсталяванне: печ з плітой для гатавання, рондалі для адвараў, біксы для налівак, збаны, патэльні, сіты, колбы, мензуры, шалі, прэсы, млыны, разакі і інш. У гэтым аптэчным памяшканні раслінная сыравіна з дапамогай спецыяльных прылад працы ператваралася ў разнастайныя лекі. У экспазіцыі прадстаўлены лекавыя сродкі, аптэчны посуд і абсталяванне, медыцынскі інструментарый, дакументы і кнігі XVIII – першай паловы XX ст. У аптэцы-музеі наведвальнікі могуць набыць травяную гарбату і разнастайныя зборы. Сёння дзень гродзенская аптэка-музей з’яўляецца вядомым турыстычным аб’ектам, які ўключаны ў шматлікія турыстычныя маршруты [1].

Праведзенае даследаванне паказвае, што рэпрэзентацыя народнай медыцыны пераважна адбываецца ў агульнамедыцынскіх, персанальных і тэматычных медыцынскіх музеях. У Беларусі існуе невялікая колькасць музеяў і экспазіцый, непасрэдна прысвечаных народнай медыцыне, аднак падрабязны разгляд іх дзейнасці паказвае, што большая частка з’яўляецца ўстано-

вамі музейнага ці змешанага тыпу і выконвае толькі асобныя музейныя функцыі.

*1.* Аптека-музей ООО «НПК Биотест» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.am.biotest.by. – Дата доступа: 05.06.2024.

*2.* Беларускае мястэчка [Электронны рэсурс] // Парк гісторыі «Вялікае княства Сула» : афіцыйный сайт. – Рэжым доступу: https://parksula.by/by/belaruskae-myastechka. – Дата доступу: 05.06.2024.

*3.* Дом-музей [Электронный ресурс] // Словарь музейных терминов. – Режим доступа: http://www.museum.ru/rme/dictionary.asp?56. – Дата доступа: 12.06.2024.

*4. Журбина, Л. П.* Музей народной медицины: этнокультурный аспект / Л. П. Журбина // Актуальные вопросы российской истории и музееведения : сб. материалов всерос. науч.-практ. конф. – Саратов : Аминрит, 2022. – Вып. 3. – С. 117–121.

*5. Леонович, Ю.* Вместо аптеки – в музей [Электронный ресурс] / Ю. Леонович // СБ. Беларусь сегодня : официальный сайт. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/vmesto-apteki-v-muzey.html. – Дата доступа: 12.06.2024.

*6. Месхидзе, Д. И.* Этномедицина в баскском музее истории медицины и науки / Д. И. Месхидзе // Радловский сборник: научные исследования и музейные проекты Музея антропологии и этнографии РАН в 2014 г. ; отв. ред. Ю. К. Чистов. – СПб., 2015. – С. 210–214.

*7.* Музей «Тайны целебных растений» [Электронный ресурс] // Рогачев. район. исполн. ком. : официальный сайт. – Режим доступа: https://rogachev.gov.by/uploads/files/Muzej-Tajny-tselebnyx-trav.pdf. – Дата доступа: 10.06.2024.

*8.* Музей народной медицины им. Мирзо Олимова [Электронный ресурс] // Музеи Таджикистана : электронный инвенторий. – Режим доступа: https://elint.kunstkamera.ru/catalog/muzej_narodnoj_mediciny_imeni_mirzo_olimova/. – Дата доступа: 18.06.2024.

*9.* Народная медицина // SLOVARonline. 2010–2024 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://122.slovaronline.com/42138-народная 20%медицина. – Дата доступа: 21.06.2024.

*10.* Народная медицина: резолюция 56 сессии Всемирной Ассамблеи здравоохранения [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://apps.who.int/gb/ebwha/pdf_files/WHA56/ra56r31.pdf. – Дата доступа: 18.06.2024.

*11. Пашков, К. А.* История международных ассоциаций медицинских музеев / К. А. Пашков, М. С. Туторская, Н. В. Чиж // Проблемы социальной гигиены, здравоохранения и истории медицины. – 2018. – № 26 (3). – С. 169–173.

*12.* Постоянная экспозиция [Электронный ресурс] // Музей истории медицины Беларуси : официальный сайт. – Режим доступа: https://rsml.by/ru/museum-history/museum-exh/. – Дата доступа: 17.06.2024.

*13.* Филиал традиционной культуры «Дом травника» в дер. Стрельно [Электронный ресурс] // учреждение культуры «Мотольский музей народного творчества» : официальный сайт. – Режим доступа: http://motol.museum.by/be/node/59923. – Дата доступа: 12.06.2024.

*14.* Филиал традиционной культуры «Дом травника» в дер. Стрельно Мотольского музея народного творчества [Электронный ресурс] // отдел по образованию Ивановского райисполкома : официальный сайт. – Режим доступа: http://ivanovo.edu.by/ru/main.aspx?guid=14181. – Дата доступа: 12.06.2024.

*15.* Ausstellung // Kneipp-Museum Bad Worishofen [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.kneippmuseum.de/ausstellung. – Date of access: 24.06.2024.

*16.* Museum am Strom // Bingen am Rhein 2024 [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.bingen.de/kultur/museum-am-strom. – Date of access: 24.06.2024.

***Лу Ся,***
***Белорусский государственный университет культуры и искусств,***
***г. Минск***

## ЛЕКАРСТВЕННЫЕ РАСТЕНИЯ СЫЧУАНИ

Провинция Сычуань, расположенная во внутренней части юго-западного Китая, богата растительными ресурсами (более 4500 видов доступных для использования растений), она представляет собой место зарождения традиционной китайской медицины. Флора является переходной между флорами умеренной и тропической зон. Рельеф, геологические и климатические условия местности определили чрезвычайное многообразие форм высших растений (около 300 семейств, 1860 родов и 10 000 видов). Древние реликтовые деревья (гинкго, пихта серебристая, метасеквойя, кедр), папоротники, а также позже выведенные новые виды растений вместе образуют сложную и разнообразную флору провинции.

Субтропический вечнозеленый широколиственный лес – основная растительность Сычуани. На разных высотах обнаруживаются различные типы растений. Территории высоко-